ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
27.11.2023 № 519

# Білеты
# для правядзення выпускнога экзамену
# па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі»
# па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі, у тым ліку для правядзення экзамену ў парадку экстэрнату

2023/2024 навучальны год

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Выпускны экзамен па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» (далей – выпускны экзамен) праводзіцца па завяршэнні навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі з мэтай ацэньвання ўзроўню засваення вучнямі зместу адукацыі па вучэбным прадмеце.

Выпускны экзамен праводзіцца ў вуснай форме па білетах, распрацаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі вучэбных праграм па гісторыі Беларусі (VI–IX класы) для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Экзаменацыйны білет складаецца з двух пытанняў. Змястоўна першыя і другія пытанні білетаў ахопліваюць гістарычны перыяд са старажытных часоў да сучаснасці.

Першыя пытанні білетаў накіраваны на праверку засваення вучнямі найважнейшых падзей гісторыі Беларусі і прадугледжваюць вуснае ўзнаўленне вывучанага вучэбнага матэрыялу. Адказ на першае пытанне білета павінен уключаць (у залежнасці ад зместу пытання): апісанне ўказаных гістарычных фактаў, азначэнні гістарычных паняццяў, характарыстыку гістарычных асоб, якія мелі дачыненне да названых гістарычных падзей, тлумачэнне найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей паміж гістарычнымі фактамі. Адказ на першае пытанне білета павінен суправаджацца (пры магчымасці) лакалізацыяй гістарычных падзей на гістарычнай карце.

На выпускным экзамене па гісторыі Беларусі вучні могуць карыстацца вучэбнымі насценнымі картамі, атласамі, уключанымі ў Пералік насценных карт і атласаў па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі», выдадзеных РУП «Белкартаграфія» (размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале https://adu.by/ Галоўная / Адукацыйны працэс. 2023/2024 навучальны год / Агульная сярэдняя адукацыя / Вучэбныя прадметы. V–XI класы / Гісторыя Беларусі), рэпрадукцыямі мастацкіх твораў.

Другія пытанні білетаў накіраваны на праверку ўменняў вучняў працаваць з рознымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі (фрагмент дакумента, картасхема, табліца, дыяграма, фрагмент артыкула, ілюстрацыя, іншыя крыніцы). Пры адказе на другое пытанне білета вучні аналізуюць прапанаваныя 3 (тры) крыніцы інфармацыі і выконваюць 4 (чатыры) заданні да іх.

Для падрыхтоўкі да адказу на выпускным экзамене вучню адводзіцца не больш за 30 хвілін.

Члены экзаменацыйнай камісіі слухаюць адказ вучня па двух пытаннях білета, не спыняючы яго адказу. У выпадку няпоўнага адказу

вучню могуць быць прапанаваны дадатковыя пытанні ў межах вучэбнага матэрыялу, прадугледжанага білетам.

У выпадку, калі вучань не адказаў па білеце, экзаменацыйная камісія можа па яго просьбе дазволіць адказаць па іншым білеце. Пры гэтым у пратакол выніковага іспыту ўносіцца адпаведны запіс. Пытанне аб зніжэнні адзнакі вучню ў гэтым выпадку вырашае экзаменацыйная камісія.

Адказ на кожнае пытанне білета ацэньваецца па 10-бальнай шкале. Адзнака за экзамен выстаўляецца як сярэдняе арыфметычнае адзнак, атрыманых вучнем за адказ на кожнае пытанне білета, з прымяненнем правілаў матэматычнага акруглення.

Адзнакі, атрыманыя вучнямі на выпускным экзамене, аб'яўляюцца вучням пасля завяршэнні выпускнога экзамену.

## ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ БІЛЕТЫ

### Білет № 1

1. Старажытныя людзі на тэрыторыі Беларусі: засяленне тэрыторыі, занятак, асноўныя вынаходствы і адкрыцці, рэлігійныя вераванні.

2. Практычнае заданне. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

### Білет № 2

1. Полацкае і Тураўскае княствы ў X–XII стст.: тэрыторыя, дзеянні князёў па ўмацаванні княстваў, раздробленасць Полацкай і Тураўскай зямель.

2. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.

### Білет № 3

1. Хрысціянізацыя беларускіх зямель у X–XIII стст.: прычыны і значэнне прыняцця хрысціянства, рэлігійныя дзеячы-асветнікі.

2. Практычнае заданне. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.

### Білет № 4

1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага: прычыны аб'яднання беларускіх і літоўскіх зямель у адной дзяржаве, шляхі ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ.

2. Практычнае заданне. Развіццё навукі, адукацыі, культуры і спорту ў Рэспубліцы Беларусь.

Білет № 5

1. Барацьба з агрэсіяй крыжакоў у XIII–XV стст.: Уладзімір Полацкі, Давыд Гарадзенскі, Андрэй Полацкі, «Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва.

2. Практычнае заданне. Развіццё культуры ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

Білет № 6

1. Францыск Скарына – беларускі першадрукар, асветнік: жыццёвы шлях, філасофскія, рэлігійныя погляды, кнігавыдавецкая дзейнасць. Паслядоўнікі Францыска Скарыны (С. Будны, В. Цяпінскі, П. Мсціславец, М. Сматрыцкі).

2. Практычнае заданне. Грамадска-палітычнае жыццё ў БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

Білет № 7

1. Беларусь у перыяд Айчыннай вайны 1812 г.: баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, адносіны да вайны розных слаёў насельніцтва, вынікі вайны для Беларусі.

2. Практычнае заданне. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.

Білет № 8

1. Люблінская унія: прычыны, умовы, значэнне для беларускіх зямель. Барацьба ВКЛ за захаванне самастойнасці. Статут ВКЛ 1588 г.

2. Практычнае заданне. Наш край у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Білет № 9

1. Фарміраванне беларускай народнасці ў XIV–XVIII стст.: прыметы народнасці, асаблівасці іх фарміравання ў беларусаў, паходжанне назвы «Белая Русь».

2. Практычнае заданне. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў.

Білет № 10

1. Аграрная рэформа 1861 г., Сталыпінская рэформа на беларускіх землях: асноўныя мерапрыемствы, асаблівасці правядзення, вынікі і значэнне.

2. Практычнае заданне. Вялікая Айчынная вайна ў гістарычнай памяці беларускага народа.

Білет № 11

1. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі: асноўныя падзеі, беларускі нацыянальны рух.

2. Практычнае заданне. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Білет № 12

1. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны: асноўныя падзеі, вынікі і наступствы для беларускіх зямель.

2. Практычнае заданне. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў заходніх абласцях БССР.

Білет № 13

1. Беларусь падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г.: асноўныя падзеі, асаблівасці, першыя сацыялістычныя пераўтварэнні.

2. Практычнае заданне. Партызанскі рух і падпольная барацьба на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Білет № 14

1. Стварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ): прычыны, асноўныя падзеі, значэнне.

2. Практычнае заданне. Германскі акупацыйны рэжым на тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. Палітыка генацыду насельніцтва Беларусі.

Білет № 15

1. Беларусь у гады польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.: асноўныя падзеі, вынікі і наступствы.

2. Практычнае заданне. БССР у гады новай эканамічнай палітыкі.

Білет № 16

1. Палітыка беларусізацыі: асноўныя мерапрыемствы і вынікі. Асноўныя дасягненні навукі і адукацыі, літаратуры і мастацтва ў БССР у 1920–1930-я гг.

2. Практычнае заданне. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі ў Беларусі і іх значэнне.

Білет № 17

1. Індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР у другой палове 1920-х – 1930-я гг.: прычыны, асаблівасці правядзення, вынікі, значэнне.

2. Практычнае заданне. Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.

Білет № 18

1. Заходняя Беларусь у складзе Польшчы (1921–1939 гг.): эканамічная, нацыянальная палітыка польскіх улад. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі.

2. Практычнае заданне. Культура Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. Умовы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі.

Білет № 19

1. Подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны: абарончыя баі летам 1941 г., партызанскі і падпольны рух.

2. Практычнае заданне. Наш край у XIII–XVIII стст.

Білет № 20

1. Генацыд насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны: план «Ост», германскі «новы парадак», карныя аперацыі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

2. Практычнае заданне. Развіццё культуры на беларускіх землях у XIV–XVIII ст.

Білет № 21

1. БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.: асноўныя дасягненні ў галіне сацыяльна-эканамічнага развіцця.

2. Практычнае заданне. Падзелы Рэчы Паспалітай, уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, змены ў становішчы розных пластоў насельніцтва Беларусі.

Білет № 22

1. БССР у другой палове 1940-х – 1980-ыя гг.: асноўныя дасягненні ў галіне адукацыі, навукі, культуры.

2. Практычнае заданне. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIX – пачатку XX ст.

Білет № 23

1. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь: Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, увядзенне пасады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскія рэферэндумы.

2. Практычнае заданне. Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIV–XVIII стст.

Білет № 24

1. Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь: удзел у дзейнасці ААН, інтэграцыйных працэсах на постсавецкай прасторы.

2. Практычнае заданне. Гаспадарчае жыццё беларускіх зямель у IX–XIII стст. Шляхі ўзнікнення гарадоў, іх роля.

Білет № 25

1. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь: прыярытэты дзяржаўнай палітыкі, дасягненні ў галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сацыяльнай сферы.

2. Практычнае заданне. Усходнія славяне на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, асноўны занятак, племянныя княствы, кіраванне імі.